Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
(назва вышэйшай навучальнай установы)

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Прарэктар па вучэбнай рабоце

________________ А.В.Данільчанка
(подпіс) (прозвішча)

29.05.2014
(дата зацвярджэння)

Рэгістрацыйны № УД- 829/р.

**Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці:**

| | |
|---|---|
| **1-21 05 01** | **Беларуская філалогія (па напрамках)** |
| **1-21 05 02** | **Руская філалогія (па напрамках)** |
| (код спецыяльнасці) | (назва спецыяльнасці) |

Факультэт філалагічны
(назва факультэта)

Кафедра беларускай літаратуры і культуры
(назва кафедры)

Курс (курсы) IV

Семестр (семестры) 8

Лекцыі 22 (колькасць гадзін) — Экзамен 8 (семестр)

Практычныя (семінарскія) заняткі 8 (колькасць гадзін) — Залік ________ (семестр)

УСР 6 (колькасць гадзін) — Курсавы праект (работа) _____

Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне 36

Усяго гадзін па дысцыпліне 80 — Форма атрымання вышэйшай адукацыі стацыянар

Склала: Шамякіна Т.І., доктар філалагічных навук, прафесар.

2014 г.

186

Вучэбная праграма складзена на аснове праграмы: "Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры" . Дата зацвярджэння 11.12.2008. Рэгістрацыйны нумар ТД-Д.048/тып.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на пасяджэнні кафедры
беларускай літаратуры і культуры
(назва кафедры)

27 мая 2014 г., пратакол № 9
(дата, нумар пратакола)

Загадчык кафедры
_______________ Т.І.Шамякіна
(подпіс)

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Навукова-метадычнай камісіяй філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(назва вышэйшай навучальнай установы)

29 мая 2014 г., пратакол № 6
(дата, нумар пратакола)

Старшыня
_______________ М.М. Хмяльніцкі
(подпіс)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Ва ўмовах сённяшняга глабальнага крызісу – экалагічнага, духоўнага, маральна-этычнага, – асаблівае значэнне набывае сістэматычнае і планамернае вывучэнне студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў гісторыі сусветнай культуры – адной з базавых дысцыплін у сістэме адукацыі. Толькі выхаванне ў атмасферы сапраўднай культуры можна лічыць па-сапраўднаму ідэалагічным – без панылай дыдактыкі і дагматызму. Выхаванне культурай – гэта ўваскрэсенне памяці духоўных вытокаў, вяртанне да светапогляднай паўнаты, да сапраўднай творчасці.

Адным з прыярытэтных напрамкаў развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі робіцца яе гуманітарызацыя, пад'ём агульнай культуры будучых спецыялістаў. Веданне гісторыі сусветнай культуры дае чалавеку магчымасць далучыцца да духоўнага вопыту старэйшых пакаленняў, стварае патэнцыяльныя магчымасці для ўсебаковага развіцця асобы і далучэння яе да агульначалавечых ідэалаў.

У аснове культуры – іерархія каштоўнасцей. Такім чынам, праз культуру можна далучаць маладыя людзей да аксіялагічнага боку быцця. Важнейшую рысу культуры – яе пераемнасць – можна рэалізаваць толькі ў сістэматызаваным, лагічна пабудаваным курсе. Самастойна авалодаць усімі скарбамі сусветнай культуры, нягледзячы на ўсе сучасныя тэхналогіі, немагчыма. Акрамя таго, сёння ні адна з'ява, што мае дачыненне да філалогіі, не можа быць разгледжана без культуралагічнага кантэксту: без яго любы дыскурс ужо будзе няпоўным.

Ва ўмовах глабалізацыі вывучэнне сусветнай культуры – пры веданні сваёй, нацыянальнай – набывае асаблівае значэнне.

Праграма разлічана на студэнтаў філалагічных факультэтаў і улічвае пепярэдне атрыманыя веды па гісторыі сусветнай літаратуры, веданне ў цэлым культурных эпох і некаторыя папярэднія звесткі па розных відах мастацтва.

У Праграме прадугледжана актуалізацыя міжпрадметных сувязей па гісторыі культуры і гісторыі нацыянальнай, рускай і сусветнай літаратуры, гісторыі Беларусі, міфалогіі, фалькларыстыкі і некаторых іншых дысцыілан.

Праграма арыентавана на пошук гібкіх сувязей паміж культурна-гістарычнамі і ўласна філалагічнымі праблемамі. Прычым мастацкая літіратура паказана тут яе індыкатар стану культуры. Асаблівае значэнне нададзена ўсіходнім цывілізацыям, бо Кітай і Індыя выходзяць сёння ў лідэры сусветнага развіцця. У гэтым – наватарства Праграмы і яе адрозненне ад іншых праграм падобнага тыпу (у прыватнасці, па культуралогіі). Праграма ў цэлым пабудавана нетрадыцыйна, арыгінальна, з улікам навейшых дасягненняў у навуцы. Праграма сістэматызуе вялікі тэарэтыка-практычны матэрыял, неабходны менавіта студэнтам-філолагам для лепшага засваення імі асноўных дысцыплін спецыялізацыі.

**Мэта Праграмы:** раскрыццё сутнасці культуры і заканамернасцей яе гістарычнага развіцця, асэнсаванне унікальнага вопыту дыялога культур, што

асабліва важна ва ўмовах глабалізацыі. Фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу да вывучэння з'яў культуры, што асноўваецца на разуменні навуковай карціны свету.

**Задачы:**

- паказаць значэнне канцэпцыі культуры ў цэлым і яе асноўных структурных элементаў у дынаміцы развіцця;
- асэнсаваць асаблівасці розных тыпаў культуры, перспектыў духоўнага развіцця чалавецтва;
- вывучыць гісторыю сусветнай культуры як сістэмы, як цэласнасці;
- паказаць значэнне філасофіі, мастацтва, рэлігіі, навукі як унікальных каштоўнасцей чалавецтва;

Пры вывучэнні дысцыпліны студэнты павінны:

**ведаць**:

- асноўныя этапы развіцця культуры ў сувязі з гісторыяй чалавецтва;
- адрозненне культуры і цывілізацыі, характэрныя асаблівасці розных цывілізацыйных тыпаў, у тым ліку, сучаснай чалавечай цывілізацыі;
- асноўныя культурныя дасягненні пэўных геаграфічных рэгіёнаў і народаў;
- асноўныя шэдэўры мастацтва, створаныя геніямі чалавецтва;
- крытэрыі мастацкай ацэнкі твораў мастацтва.

**умець:**

- бачыць сувязь развіцця мастацтва з рэлігійнымі, філасофскімі пошукамі, дасягненнямі навукі і адукацыі;
- бачыць значэнне мастацкай літаратуры як індыкатару стану культуры;
- аналізаваць творы сусветнага мастацтва з эстэтычнага пункту гледжання;
- характарызаваць творы класічнай і масавай культуры.

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## УВОДЗІНЫ

Тэарэтычна-паняційнае азначэнне культуры.Эвалюцыя поглядаў на сутнасць культуры. Прырода і культура. Паняцці культуры і цывілізацыі, іх адрозненні. Культурны вектар гісторыі.

## ЧАСТКА 1.
## ЛЯ ВЫТОКАЎ КУЛЬТУРЫ. КУЛЬТУРА ПАЛЕАЛІТУ І НЕАЛІТУ

Антрапагенезіс. Станаўленне першабытанай культуры.

Архаічны (даміфалагічны) светапогляд. Татэмізм як адна з найбольш старажытных форм вераванняў (эпохі палеаліту).. Анімізм як тып светаадуування дагістарычнай эпохі. Міфалогія і яе значэнне. .

Выяўленчае мастацтва эпохі палеаліту.

Дасягненні неалітычнай рэвалюцыі.

Курганна-мегалітычная культуры V–I тыс. да н.э. у Еўразіі. Цывілізацыя Чатал-Гуюка.

Праблема прарадзімы індаеўрапейцаў.

## ЧАСТКА 2.
## СТАРАЖЫТНЫЯ УСХОДНІЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

### Культура Егіпта

*Агульная характарыстыка.* Геаграфічнае палажэнне. Этнагенезіс. Міфалагічная гісторыя. Асноўныя этапы рэальнай гісторыі. Вывучэнне Старажытнага Егіпта.

*Культура эпохі Старажытнага Царства.* Рэлігійныя вераванні. Пантэон. Уяўленні пра душу. Піраміды.

*Культура эпохі Сярэдняга Царства.* Роспісы пахавальняў. Асноўныя выяўленчыя каноны. Шэдэўры скульптуры. Літаратура Старажытнага Егіпта.

*Культура эпохі Новага Царства.* Эпоха царыцы Хатшэпсут. Рэлігійная рэформа фараона Эхнатона. Мастацтва эпохі Эхнатона. Пахавальня Тутанхамона – дасягненні ў дэкаратыўным мастацтве. Храмы і скульптуры эпохі Рамсесаў: Луксор, Карнак. Значэнне культуры Старажытнага Егіпта ў гісторыі чалавечай цывілізацыі.

*Егіпет эпохі элінізму.* Характарыстыка эпохі. Александрыя як культурны цэнтр. Александрыйская філалагічная школа. Александрыйскі маяк – адно з цудаў свету.

*Сярэднявечны Егіпет.* Хрысціянства ў Егіпце. Коптская царква. Помнікі іслама ў Каіры. Археалагічныя адкрыцці XIX стагоддзя.

*Сучасны Егіпет.* Гісторыя Егіпта ў XX стагоддзі. Асноўныя турыстысныя аб’екты на тэрыторыі Егіпта.

## Культура Месапатаміі

*Шумерская цывілізацыя.* Міфалогія шумераў. Асноўныя дасягненні ў навуцы і тэхналогіях. “Эпас пра Гільгамеша” – першы літаратурны твор чалавецтва. Архітэктура шумераў (зікураты).

*Вавілонскае царства.* Дасягненні ў будаўніцтве дзяржавы, права. Літаратурныя творы. Развіццё навукі. Вавілон – шэдэўр горадабудаўніцтва.

*Асірыя.* Арганізацыя войска. Сталіца дзяржавы – горад Ніневія. Роспісы і барэльефы. Бабліятэка цара Ашурбаніпала. Асірыйскі этнас у гісторыі.

*Арабскі халіфат. Ірак.* Фарміраванне ісламскай цывілізацыі. Заваяванні арабаў. Багдад. Свяшчэнныя гарады Ірака – Нэджэф  і Кербела. Казкі “1001 ночы”. Сучасны лёс Ірака.

## Культура Ірана (Персіі)

*Арыяна. Авеста.* Авеста – найбольш старажытная свяшчэнная кніга чалавецтва. Асаблівасці рэлігіі зараастрызму.

*Культура Персіі імперскага перыяду.* Фарміраванне імперыі Кіра. Шэдэўр горадабудаўніцтва – сталіца Персіі горад Персепаль.

*Сярэднявечная Персія і сучасны Іран.* Культавая архітэктура Сярэдняй Азіі (Бухара, Самарканд, Хіва). Дэкаратыўнае мастацтва Персіі (дываны, тканіны, чаканка). Класічная літаратура Персіі. Гістарычныя і культурныя цэнтры Персіі: Шыраз, Ісфаган, Тэгеран. Сучасны Іран і яго стасункі з Беларуссю.

## Культура Індыі

*Агульная характарыстыка.* Прырода і культура Індыі. Паходжанне шмат якіх культурных раслін з Індыі. Этналінгвістычнае багацце краіны. Індыйская кулінарыя.

*Індская і арыйская цывілізацыі.* Харапская (Індская) цывілізацыя на тэрыторыі Індыі і Пакістана. Горад Махенджа-даро – самы вялікі з раскапаных гістарычных гарадоў свету. Арыі ў Індыі. Сістэма кастаў. Веды-рэлігійны помнік арыйцаў. “Махабхарата” і “Рамаяна”  – шэдэўры літаратуры сусветнага значэння.

*Рэлігіі Індыі і звязанае з імі мастацтва.* Буддызм. Гісторыя жыцця царэвіча Гаутамы. Культура эпохі імператара Ашокі. Індуізм. Пячорныя гарады і храмавыя комплексы – Аджанта, Элора. Храмавы комплекс Каджураха ў Арысе.

*Сярэднявечная і сучасная Індыя.* Мусульманскі перыяд у гісторыі Індыі. Імперыя Маголаў. Шэдэўр архітэктуры – Тадж Махал. Каланіяльны перыяд у гісторыі Індыі. Перыяд індыйскага адраджэння (Рабіндранат Тагор). Барацьба за незалежнасць. Сучаснае імклівае развіццё Індыі.

## Культура Кітая

*Агульныя звесткія.* Геаграфічнае палажэнне. Асновы светаразумення. Міфалогія. Кітайскі каляндар. Пісьменнасць.

*Перыяд Архаікі.* Эпоха Ся. Эпоха Шан – росквіт бронзы. Эпоха Чжоў – "сто школ" у філасофіі Кітая. Дзейнасць Конфуция. Даасізм.

*Перыяд Класікі.* Утварэнне імперыі Цынь. Вялікая кітайская сцяна. Пахавальня Цынь-Шыхуандзі. Імперыя Хань – залаты век імперыі. Росквіт навукі, тэхнікі, мастацтва. Вялікі шоўкавы шлях.

*Эпоха Шасці дынастый.* Рост уплыву буддызму. Кітайска-буддысцкае храмавае дойлідства.

*Эпохі Тан и Сун.* Культурна-ідэалагічныя працэсы ў Кітаі ў VII-XII стст. Класічная паэзія эпохі Тан. Жыццё і творчасць класікаў кітайскай літаратуры Лі Бо і Ду Фу. Жывапіс Кітая эпохі Сун – асноўныя матывы, стылі, тэхнікі..

*Эпоха Мін.* Асаблівасці кітайскай архітэктуры. Планіроўка Пекіна, збудаванні Забароненага горада. Росквіт мастацкай літаратуры – зборнікі навел і класічныя раманы. Дэкаратыўнае мастацтва Кітая. Уплыў мастацтва Кітая на еўрапейскую культуру.

*Кітай ў XIX-XXI вв.* Стварэнне рэалістычных твораў. Творчасць Лу Сіня. Барацьба з Японіяй. Стварэнне КНР. Цяжкасці росту. Кітай апошняга дваццацігоддзя – мудрае правядзенне рэформ. Кітай – супердзяржава. XXI стагоддзя.

## Культура Японіі

*Агульныя звесткі.* Прыродныя ўмовы. Культура неаліту – Дзёмон. Міфалогія аўтахтоннага насельніцтва – айнаў.

*Гістарычныя гарады Японіі.* Нара – першая сталіца Японіі: першы драўляны храм, каласальная скульптура Будды. Кіёта – горад арыстакратычнай культуры: планіроўка, палацы імператара і сёгуна, асноўныя храмы, незвычайныя сады – імхоў, камянёў і інш. Жанчыны-пісьменніцы – класікі японскай літаратуры эпохі Сярэднявечча – Мірасакі Сікібу і Сей-Сёнагон. Эпоха дынастыі сёгунаў Такугава. Токіа – сталіца Японіі пасля буржуазнай рэвалюцыі 1968 года. Японія ў Другой сусветнай вайне. Гарады Хірасіма і Нагасакі.

*Традыцыйная культура Японіі.* Рэлігіі буддызм і сінтаізм. Культ гары Фудзіямы. Жанчыны і дзеці Японіі. Класічны тэатр Кабукі. Класікі жывапісу – Хірасіга і Хокусаі. Традыцыйны японскі сад. Рытуал таною. Традыцыйныя мастацтвы – ікебана і бансай. Японскія народныя святы.

# ЧАСТКА 3.
# ЗАХОДНЯЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ

## Культура Антычнасці

*Крыта-мікенскі перыяд:* перасоўванні індаеўрапейскіх плямёнаў ў III-II тыс.да н.э. па Еўропе і Міжземнамор'ю. Фарміраванне грэчаскай міфалогіі. Мінойская культура вострава Крыт. Сімволіка Лабірынта. Кноскі палац. Мікены – горад сямейных драм эпохі Антычнасці. Пагібель Троі – важнейшая падзея архаічнай гісторыі.

*Антычная Грэцыя перыяду Архаікі:* Адраджэнне Грэцыі пасля “цёмных стагоддзяў”. Полісная сістэма дзяржаўнасці. Алімпійскія гульні. Міфалогія Антычнай Грэцыі: пантэон, асноўныя цыклы міфаў. Элінскій эпас. Грэчаская лірыка. Натурфілосафы эпохі Архаікі. Грэчаскі архітэктурны ордэр. Скульптура. Дэкаратыўнае мастацтва.

*Антычная Грэцыя перыяду Класікі:* Палітычная культура старажытных грэкаў. Класічны перыяд у гісторыі філасофія. Афіны – цэнтр адукацыі і культуры. Акадэмія Платона і Ліцэй Арыстоцеля. Антычныя каляндарныя містэрыі і мастацтва драмы. Афінскі Акропаль – шэдэўр антычнай архітэктуры. Алімпія. Скульптары эпохі Класікі. Сямейныя адносіны і быт грэкаў.

*Культура Анычнага Рыма*: Асноўныя гістарычныя падзеі і культурныя дасягненні. Рымская міфалогія. Пунічныя войны і грамадзянская вайна I ст. да н.э. Дзейнасць Юлія Цэзара. Юліянскі каляндар. “Залаты век” імператара Аўгуста. Тэатр і святы. Рымскі раман. Скульптурны партрэт. Уплыў культуры Рыма на станаўленне Заходняй цывілізацыі. Права і дзяржаўныя інстытуты. Навука і адукацыя. Рымскія гісторыкі. Асноўныя архітэктурныя формы, тыпы будынкаў. Рымскае дойлідства, Пампеі, Баальбек. Побыт.

*Культура элінізму:* Паходы Аляксандра Македонскага. Сінтэз мастацтва Захада і Усхода. Інтэнсіўнасць развіцця мастацтва. Асноўныя дасягненні эпохі. Цуды свету. Скульптура.

## Старажытная Палесціна і ўзнікненне хрысціянства

*Гісторыя яўрэйскага народа. Іудаізм.* Геаграфічнае, сакральнае палажэнне Палесціны, флора і фаўна. Архаічная гісторая. Патрыярхі яўзрэйскага народа. Стварэнне дзяржавы Ізраіль паводле Бібліі. Дзейнасць першых цароў. Іерусалімскі храм. Вавілонскі палон. Перыяд Другога храма.

*Біблія, яе значэнне.* Структура Бібліі. Асноўныя кнігі Старога Запавету.

*Хрысціянства.* Сацыяльна-палітычнае палажэнне Іудзеі як правінцыі Рыма ў I ст. да н.э., I ст. н.э. Іаан Хрысціыель. Жыццё Хрыста. Новы Запавет. Асновы хрысціянскай рэлігіі. Фарміраванне і станаўленне хрысціянскай царквы.

## Культура Візантыі

Этапы станаўлення “другога Рыма”. Канстанцінопаль – горад на двух кантынентах. Святая Сафія. Візантыйскі архітэктурны стыль – шэдэўры дойлідства ў розных краінах. Літаратура Візантыі. Тэалогія. Візантыя і славянскі свет.

## Культура Сярэднявечча

*Ранняе Сярэднявечча.* Перыядызацыя. Сацыяльна-палітычная абстаноўка ў Еўразіі. Вялікае перасяленне народаў. Станаўленне сістэмы сусветных рэлігій. Іслам. Арабскі халіфат.

*Позняе Сярэднявечча*: Чаша Грааля як містычны сімвал Сярэднявечча і звязаная з ім літаратура. Паходы крыжакоў. Рэкансіста ў Іспаніі. Адкрыццё Амерыкі.

*Асноўныя архітэктурныя стылі Сярэднявечча*: візантыйскі, маўрытанскі, раманскі, гатычны.

*Еўразійская культура*: культурныя дасягненні народаў Каўказа і Сярэдняй Азіі. Стварэнне дзяржавы Чынгісхана, Асманскай імперыі.

*Культура Мезаамерык:* цывілізацыя альмекаў, тальцекаў, майя, інкаў.

## Эпоха Адраджэння

*Агульная характарыстыка эпохі:* Прырода і культура. Вялікія геаграфічныя адкрыцці. Рэфармацыя. Архітэктурны стыль рэнесанс. Асноўныя дасягненні ў галіне навукі і тэхнікі.

*Культура Італіі.* Гарады Італіі ў эпоху Адраджэння: Фларэнцыя, Венецыя, Мілан, Рым. Жывапіс. Італьянскія жывапісныя школы. Аналіз творчасці Леанарда да Вінчы, Мікельанджала, Тыцыяна, Бацічэлі, Рафаэля.

*Паўночнае Адраджэнне*: Творчасць Альбрэхта Дзюрэра, Іераніма Босха, Пітэра-Брэйгеля, іх актуалізацыя ў мастацтве ХХ ст.

*Адраджэнне ў краінах Еўропы*: Францыя: літаратура, архітэктура, Англія: література, архітэктура, тэатр. Іспанія: літаратура, тэатр, архітэктура. Рэнесанс у славянскіх краінах.

## Культура Захаду Новага часу

*Еўрапейская культура XVII ст.* Пераходны характар культуры – ад Сярэднявечча да Новага часу. Класіцызм. Барока як стыль эпохі. Фламандская школа жывапісу.

*Эпоха Асветы*: Філасофія Новага часу. Секулярызацыя. Асноўныя мастацкія напрамкі. Культура ракако. Мастацтва Францыі, Англіі, Іспаніі, Германіі. Венская школа ў музыцы.

*Культура Захаду ў XIX ст.*: Агульная характарыстыка эпохі. Дасягненні ў навуцы і тэхніцы. Эпоха рамантызму. Стагоддзе літаратуры, музыкі, тэатра. Стыль ампір. Новыя напрамкі ў архітэктуры.

*Культура мяжы стагоддзяў.* Філасофія Новага часу. Новыя тэндэнцыі ў мастацтве. Стыль мадэрн.

*Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці культуры ХХ – пачатку XXI стст.:* Асноўныя сацыяльна-палатычныя падзеі стагоддзя. Навукова-тэхнічны прагрэс і гуманітарная культура. Пошукі рэалістычнага мастацтва. Напрамкі мадэрнізму. Стылі ў архітэктуры. Развіццё кіно. Эстэтыка постмадэрнізму.

## ЧАСТКА 4.
## БЕЛАРУСКАЯ, СЛАВЯНСКАЯ, РУСКАЯ КУЛЬТУРА

### Славянская культура

Славянскі свет. Праблема этнагенезу славянскіх народаў. Культура старажытных славян. Міфалогія і рытуалы. Дзяржавы на тэрыторыі славян, іх культура (Вялікая Маравія, Балгарскае царства. Сербія, Чэхія і інш.

### Культура эпохі Кіеўскай Русі

Розныя тэорыі ўзнікнення Рускай дзяржаўнасці. Хрышчэнне Русі. Першыя рускія святыя. Культура Кіеўскага княства, Уладзіміра-Суздальскага, Наўгародскага. Полацкае і Тураўскае княствы. Татара-мангольскае нашэсце і лёс усходніх славян.

### Маскоўская Русь

Масква ў розныя гістарычныя перыяды. Школа іканапісу. Святы Андрэй Рублёў. Канцэпцыя "Масква – Трэці Рым". Крэмль.

### Станаўленне Расійскай імперыі

Ад Русі да Расіі. Дойлідства XVI ст. – фарміраванне "рускага стыля". Дзейнасць Сімяона Полацкага яг ўплыў на культуру Масковіі. Царкоўны раскол.

### Вялікае княства Літоўскае і Польшча

Фарміраванне беларускай народнасці. ВКЛ. Гісторыя Вільні. Рост гарадоў. Летапісанне. Рэлігійна-царкоўная барацьба. Архітэктура і тэатр на Беларусі. Рамёслы. Быт. Заняпад культуры ў XVII – XVIII стст.

### Расійская імперыі ў XVIII ст.

Рэформы Пятра І ў галіне культуры. Класіцызм і барока ў мастацтве. Горад Пецярбург – галоўнае дасягненне эпохі.

### Руская культура Залатога і Сярэбранага веку

Агульная характарыстыка сацыяльна-палітычнага становішча Расіі ў XIX ст. Беларусь у складзе Расіі. Навука і адукацыя. Дзейнасць заходнікаў і славянафілаў. Росквіт архітэктуры. Уплыў літаратуры на тэатр і іншыя віды мастацтва. Рамантызм у жывапісе. Творчасць перасоўнікаў. Развіццё музыкі: асноўныя дасягненні. Мастацкія напрамкі ў культуры Сярэбранага веку (пачатак XX ст.).

### Савецкая культура

Напрамкі ў літаратуры і мастацтве савецкага часу**.** Шэдэўры архітэктуры (на прыкладзе Масквы, Мінска). Савецкая музыка, жывапіс, кіно, тэатр.

## Постсавецкая культура

Развіццё культуры постсавецкіх рэспублік. Архітэктура і дэкаратыўнае мастацтва эклектычнага характару. Філасофія і мастацтва постмадэрнізму. Лёс культуры ў тэхнагеннай прасторы, у спажывецкім грамадстве.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

| №п/п | Назвы раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | **Аўдыторныя** | | | | Самаст. работа |
| | | Лекцыі | Практыч., семінар. | Лаб. занят. | КСР | |
| 1 | Паняцце культуры. Культура і цывілізацыя | 2 | | | | 2 |
| 2 | Культура палеаліту і неаліту | 2 | | | | 2 |
| 3 | Культура Егіпта | 4 | | | | 2 |
| 4 | Культура Месапатаміі | 2 | | | | 2 |
| 5 | Культура Персіі | 2 | | | | 2 |
| 6 | Культура Індыі | 2 | | | 2 | 2 |
| 7 | Культура Кітая | 2 | | | 2 | 2 |
| 8 | Культура Японіі | 2 | | | | 2 |
| 9 | Антычная Грэцыя | 2 | | | | 4 |
| 10 | Культура антычнага Рыма | 2 | | | | 2 |
| 11 | Культура Еўропы эпохі Сярэднявечча і Адраджэння | 2 | | | | 6 |
| 12 | Старажытная Іўдзея і ўзнікненне хрысціянства | | 2 | | | 2 |
| 13 | Культура Візантыі | | | | | 4 |
| 14 | Культура Беларусі ў старажытнасці і ў Новым часе | | 2 | | | 2 |
| 15 | Руская культура | | 4 | | | 2 |
| 16 | Заходняя культура Новага часу | | | | 2 | 2 |
| 17 | "Беларуская сядзіба" | | | | 2 | 2 |
| 18 | "Архітэктурныя помнікі Беларусі" | | | | 2 | 2 |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў, пералік пытанняў для вывучэння | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (нагляндыя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | кіруемая самастойная работа студэнтаў | | | |
| **1.** | **Паняцце культуры. Культура і цывілізацыя** | 2 | | | 1 | | | |
| | 1. Розныя азначэнні культуры.<br>2. Адрозненне культуры і цывілізацыі.<br>3. Этапы развіцця культуры. | | | | | Схемы | 1, 7, 15, 16, 17, 19, 30, 31, 125, 126, 151, 155, 157, 172 | Гутарка |
| **2.** | **Культура палеаліту і неаліту** | 2 | | | 1 | | | |
| | 1. Фарміраванне міфалогіі.<br>2. Культурная рэвалюцыя эпохі неаліту.<br>3. Курганна-мегалітычная культура. | | | | | Мастацкія альбомы | 5, :6, 37, 77, 102, 114, 117, 119, 121, 122, 123, 145, 147 | Гутарка |
| **3.** | **Культура Егіпта** | 4 | | | 2 | | | |
| | 1. Вераванні, мастацтва старажытнага Егіпта.<br>2. Егіпет эпохі элінізму.<br>3. Старажытны і сучасны Егіпет. | | | | | Відэаматэрыялы, мастацкія альбомы | 34, 40, 97, 101, 116, 142, 161, 162, 163, | Творчая работы |
| **4.** | **Культура Месапатаміі** | 2 | | | 2 | | | |
| | 1. Шумер.<br>2. Вавілон.<br>3. Асірыя.<br>4. Ірак.<br>5. Ісламская цывілізацыя. | | | | | Відэаматэрыялы, мастацкія альбомы | 18, 20, 91, 95, 101, 109, 116, 130, 162, | Творчая работа |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **5.** | **Культура Персіі** | 2 | | | 2 | | | |
| | 1. Зараастрызм. Авеста.<br>2. Персепаль.<br>3. Класічная літаратура Персіі. | | | | | Відэаматэ-рыялы, альбомы | 18, 20, 68, 84, 87, 109, 128, 162 | Творчая работа |
| **6.** | **Культура Індыі** | | | 2 | 3 | | | |
| | 1. Індская цывілізацыя.<br>2. Індуізм.<br>3. Буддызм.<br>4. Класічныя эпасы.<br>5. Індыя сярэднявечная і сучасная. | | | | | Відэаматэ-рыялы, мастацкія альбомы | 9, 20, 35, 41, 42, 43, 55, 67, 101, 112, 148, | Калоквіум |
| **7.** | **Культура Кітая** | | | 2 | 3 | | | |
| | 1. Імперскія дынастыі Шан, Чжоў, Цынь, Хань, Тан, Мін.<br>2. Сусветнае значэнне дасягненняў кітайскай цывілізацыі<br>3. Сучасны Кітай. | | | | | Відэаматэ-рыялы, мастацкія альбомы | 4, 41, 42, 43, 48, 50, 62, 101, 111, 153, 165 | Пісьмовая работа |
| **8.** | **Культура Японіі** | 2 | | | 1 | | | |
| | 1. Гістарычныя гарады.<br>2. Традыцыйныя віды мастацтва. | | | | | Мастацкія альбомы | 63, 64, 89, 98, 101, 118, 160, 173 | Гутарка |
| **9.** | **Антычная Грэцыя** | 4 | | | 2 | | | |
| | 1. Філасофія антычнай Грэцыі<br>2. Мастацтва антычнай Грэцыі розных перыядаў (крыта-мікенскі, архаіка, класіка, элінізм). | | | | | Відэаматэ-рыялы, мастацкія альбомы | 2, 8, 10, 11, 36, 45, 49, 61, 97, 100, 105, 127, 131 | Апытван-не |
| **10.** | **Культура антычнага Рыма** | 2 | | | 1 | | | |
| | 1. Этапы з развіцці культуры<br>2. Архітэктурныя формы.<br>3. Уплыў культуры антычнага Рыма на Заходнюю цывілізацыю. | | | | | Мастацкія альбомы Відэаматэры ялы | 10, 21, 47, 49, 96, 99, 101, 132, 149 | Апытван-не |
| **11.** | **Культура Еўропы эпохі Сярэднявечча і Адраджэння** | 2 | | | 1 | | | |
| | 1. Гісторыя і культура<br>2. Архітэктурныя стылі: візантыйскі, | | | | | Мастацкія альбомы | 25, 26, 27, 29, 32, 39, 51, 59, 60, 66, | Апытван-не |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | раманскі, маўрытанскі, готыка<br>3. Мастацкія дасягненні эпохі Адраджэння | | | | | | 69, 73, 80, 103, 106, 156, | |
| **12.** | **Старажытная Іўдзея і ўзнікненне хрысціянства** | | 2 | | 2 | | | |
| | 1. Святая Зямля.<br>2. Жыццё Хрыста.<br>3. Біблія, яе структура і значэнне.<br>4. Хрысціянская Царква. | | | | | Мастацкія альбомы, відэаматэрыялы | 70, 92, 101, 120, 129, 135, 150, 158, 171 | Апытван-не |
| **13.** | **Культура Візантыі** | | 2 | | 2 | | | |
| | 1. Мастацтва Візантыі.<br>2. Візантыя і славянскі свет. | | | | | Мастацкія альбомы | 12, 22, 46, 83, 85 | Апытван-не |
| **14.** | **Культура Беларусі ў старажытнасці і ў Новым часе** | | 2 | | 2 | | | |
| | 1. Міфалогія, народная культура<br>2. Полацкае і Тураўскае княствы.<br>3. Культура эпохі Адраджэння, Барока.<br>4. Беларуская культура XIX-XXI ст.ст. | | | | | Кіна- і фота-матэрыялы, музеі | 24, 52, 58, 72, 108, 110, 167, 168, 169 | Апытван-не |
| **15.** | **Руская культура** | | 2 | | 2 | | | |
| | 1. Кіеўская Русь.<br>2. Уладзіміра-Суздальскае і Наўгародскае княствы.<br>3. Маскоўская Русь.<br>4. Культура ў эпохі Барока і Асвета.<br>5. Залаты век рускай культуры. | | | | | Кіна- і фота-матэрыялы, мастацкі музей | 24, 57, 71, 76, 78, 86, 88, 107, 115, 136, 137, 138, 143, 152 | Апытван-не |
| **16.** | **Заходняя культура Новага часу** | | | 2 | 6 | | | |
| | 1. Асноўныя тэндэнцыі развіцця заходняга мастацтва Новага часу.<br>2. Шэдэўры мастацкай культуры Еўропы і Амерыкі XVIII-XXI ст.ст.<br>3. Савецкая цывілізацыя.<br>4. Расія і Беларусь у постсавецкім часе | | | | | Кіна- і фота-матэрыялы, музеі, мастацкія альбомы | 3, 13, 14, 21, 28, 38, 44, 53, 54, 56, 65, 74, 79, 80, 81, 90, 93, 94, 113, 134, 139, 140, 141, 146, 159, 164, 166 | Тэсты |

## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА


1. Абдеев Р.Ф. Философия информационной цивилизации. М., 1994.
2. Авдеев А.Д. Происхождение театра. М., 1959.
3. Актуальные проблемы культуры XX века / Под ред.В.И.Добрынина. М., 1993.
4. Алексеев В.М. Китайская культура. М., 1978.
5. Алексеев В.П. Становление человечества. М., 1084.
6. Алексеев В.П., Першиц А.И. История первобытного общества. М., 1979.
7. Алексеева В.В. Что такое искусство? М., 1991.
8. Алпатов М. Этюды по всеобщей истории искусств. М., 1979.
9. Альбедиль М.Ф. Протоиндийская цивилизация. Очерки культуры. М., 1994.
10. Античная культура и современная наука. М., 1985.
11. Античная цивилизация. М., 1973.
12. Античность и Византия. М., 1975.
13. Арган Дж. История итальянского искусства. В 2-х т. М., 1990.
14. Аронов В.Р. Художники и предметное творчество: Проблемы взаимодействия материальной и художественной культуры XX века. М., 1987.
15. Артановский С.Н. Историческое единство человечества и взаимное влияние культур. Л., 1967.
16. Артановский С.Н. На перекрестке идей и цивилизаций. Спб., 1994.
17. Арутюнов С.А. Народ и культуры: развитие и взаимодействие. М., 1986.
18. Афанасьева В.К. и др. Искусство Древнего Востока. М., 1976.
19. Бабушкин С.А. Теория цивилизации. Курск, 1997.
20. Бадик А.М. История Древнего мира. Мн., 1998.
21. Базен Ж. История истории искусств: От Вазари до наших дней. М., 1994.
22. Банк А.В. Культура и искусство Византии IV-XV вв. М., 1957.
23. Банфи А. Философия искусства. М., 1989.
24. Барокко в славянских культурах. М., 1985.
25. Бартенев И.А., Батажкова В.Н. Очерки истории архитектурных стилей. М., 1983.
26. Баткин Л.В. Итальянские гуманисты: Стиль жизни, стиль мышления. М., 1978.
27. Баткин Л.В. Итальянское Возрождение в поисках индивидуальности. М., 1989.
28. Батракова С.П. Искусство и утопия: Из истории западной живописи и архитектуры XX века. М., 1990.
29. Бенеш О. Искусство Северного Возрождения. М., 1973.

30.Бердяев Н.А. Философия творчества, культуры и искусства: В 2 т. М., 1994.
31.Библер В.Г. На грани логики культуры. М., 1991.
32.Бицилли П.М. Место Ренессанса в истории культуры. СПб., 1996.
33.Боголюбов Е.В. Культура и общество (вопросы истории и теории). М., 1978.
34.Богословский Е.С. Повседневная жизнь в Древнем Египте. М., 1994.
35.Бонгард-Левин Г.М. Древнеиндийская цивилизация: Философия, наука и религия. М., 1980.
36.Боннар А. Греческая цивилизация. М., 1992.
37.Борисковский П.И. Древнейшее прошлое человечества. М., 1990.
38.Борьба тенденций в современном западном искусстве. М., 1986.
39.Брагина Л.М. Итальянский гуманизм. М., 1977.
40.Брайтон П. Путешествие в сакральный Египет. М., 1997.
41.Буддизм и культурно-психологические традиции народов Востока. Новосибирск. 1990.
42.Буддизм. История и культура. СПб. М., 1989.
43.Буддийский взгляд на мир. СПб., 1994.
44.Быстрова А.Н., Киселев В.А. Мир культуры и культура мира. Новосибирск, 1996.
45.Быт и история в античности. М., 1988.
46.Бычков В.В. Малая история византийской эстетики. Киев, 1991.
47.Бычков В.В. Эстетика поздней античности. М., 1981.
48.Васильев Л.С. История религии Востока. М., 1988.
49.Винничук Л. Люди, нравы и обычаи Древней Греции и Рима. М., 1988.
50.Виноградова Н.А., Николаева Н.С. Искусство стран Дальнего Востока. М., 1979.
51.Виппер Б.Р. Итальянский Ренессанс. В 2 т. М., 1977.
52.Воинов А.А. История архитектуры Белоруссии. Т.1-2. Мн., 1987.
53.Волков И.Ф. Творческие методы и художественные системы. М., 1989.
54.Всеобщая история искусств: В 6 т. М., 1960-1966.
55.Гачев Г. Образы Индии. М., 1993.
56.Генон Р. Кризис современного мира. М., 1991.
57.Герцук Ю. Русское искусство с древних времен до начала Хх века. М., 1979.
58.Гісторыя беларускага мастацтва. У 6 т. Мн., 1994.
59.Гнедич П.П. Всемирная история искусств. М., 1996.
60.Гомбрил Э. История искусства. М., 1998.
61.Грейвс Р. Мифы Древней Греции. М., 1992.
62.Григорьева Т.П. Дао и логос (встреча культур). М., 1992.
63.Григорьева Т.П. Красотой Японии рожденный. М., 1993.
64.Григорьева Т.П. Японская художественная традиция. М., 1979.
65.Гулыга А.Б. Искусство в век науки. М., 1978.
66.Гуревич А.Я. Средневековый мир: культура безмолвного большинства. М., 1990.

67.Гусева Н.Р. Индуизм. М., 1977.
68.Дмитриева Н.А. Краткая история искусств. Очерки. Вып.1-3. М., 1969, 1991, 1993.
69.Добиаш-Рождественская О.А. Культура западноевропейского средневековья. М., 1987.
70.Драч Г.В. Культурология. Ростов-на-Дону, 1997.
71.Долгополов И.В. Мастера: Новеллы о художниках. М., 1981.
72.Дорошевич Э., Конон В. Очерк истории эстетической мысли Беларуси. Мн., 1992.
73.Жорж Дюби. Европа в средние века. Смоленск, 1994.
74.Западноевропейская художественная культура XVIII века. М., 1980.
75.Зеленинова М.Е. Советское киноискусство: Библиографический указатель. М., 1980.
76.Зотов А.М. Русское искусство с древнейших времен до начала XX века. М., 1989.
77.Иди М. Доисторический человек. Л., 1991.
78.Из истории русского искусства второй половины XИX – начала XX века. М., 1978.
79.Иконников А.В. Современная архитектура. М., 1983.
80.Ильина Т.В. История искусства. Западноевропейское искусство. М., 1983.
81.Импрессионисты, их современники, их соратники. М., 1976.
82.Индия в средние века. М., 1970.
83.Иоанн (Экономцев), игумен. Православие. Византия. Россия. М., 1992.
84.Искусство стран и народов мира: В 5 т. М., 1962-1991 (Краткая художественная энциклопедия).
85.История Византии: В 3 т. // Отв.ред. С.Д.Сказкин. М., 1967.
86.История и культура древнерусского города. М., 1989.
87.История религии. СПб., 1997.
88.История русского искусства: В 3 т. М., 1994.
89.Иэнага Сайкаку. История японской культуры. М., 1972.
90.Кантор А.И. Изобразительное искусство XX века. М., 1988.
91.Каптерева Т.П., Виноградова Н.А. Искусство средневекового Востока. М., 1989.
92.Кацельнесон М. Иерусалим – город трех религий. Спб., 1998.
93.Кертман Л.Е. История культуры стран Европы и Америки. М., 1988.
94.Классическое и современное искусство Запада: Мастера и проблемы. М., 1989.
95.Клочков И.С. Духовная культура Вавилона: Человек, судьба, время. М., 1983.
96.Кнабе Г.С. Древний Рим – история и повседневность. М., 1986.
97.Кокс Р. Семь чудес света. М., 1997.
98.Конрад Н.И. Запад и Восток. М., 1976.
99.Культура Древнего Рима. В 2 т. М, 1986.
100. Левек П. Эллинистический мир. М., 1989.

101. Левяш И.Я. Культурология. Учебное пособие для студентов вузов. Мн., 2000.
102. Леви-Стросс К. Первобытное мышление. М., 1995.
103. Ле Гроф Ж. Цивилизация средневекового Запада. М., 1992.
104. Лисичкина О.Б. Мировая художественная культура. СПб., 1997.
105. Лосев А.Ф. История античной эстетики. В 7 т. М., 1963-1988.
106. Лосев А.Ф. Эстетика Возрождения. М., 1978.
107. Лотман Ю.М. Русская культура XIX в. М., 1998.
108. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1996.
109. Любимов Л.И. Искусство Древнего мира. М., 1998.
110. Майхрович А.С. Поиск истинного бытия человека: из истории философии и культуры Беларуси. Мн., 1992.
111. Малявин В.В. Традиционная эстетика в странах Дальнего Востока. М., 1987.
112. Мартынов В.Ф. Мировая художественная культура. Мн., 2000.
113. Массовая культура и советское изобразительное искусство. М., 1988.
114. Масон М.Э. Первые цивилизации. Л., 1989.
115. Машковцев Н.Г. Из истории русской художественной культуры. М., 1982.
116. Мейсон Э. Древние цивилизации. М., 1997.
117. Мелетинский Е.М. Поэтика мифа. М., 1995.
118. Мелларт Дж. Древнейшие цивилизации Ближнего Востока. М., 1982.
119. Менар Р. Мифы в искусстве старом и новом. М., 1992.
120. Мень А.В. Культура и духовное возрождение. М., 1992.
121. Мифологический словарь. М., 2002.
122. Мифы народов мира: Энциклопедия. В 2 т. М., 1991.
123. Мифы в искусстве старом и новом. М., 1992.
124. Муратов П.П. Образы Италии. М., 1994.
125. Мыльников А.С. Основы исторической типологии культуры. Л., 1979.
126. Наливайко Д.С. Искусство: Направления, течения, стили. Киев, 1981.
127. Немировский А.И. Мифы Древней Эллады. М., 1992.
128. Немировский А.И. Мифы и легенды Древнего Востока. М., 1994.
129. Пилкингтон С.М. Иудаизм. М., 1998.
130. Пиотровский М.Б. Коранические сказания. М., 1991.
131. Полевой В.М. Искусство Греции: Древний мир. Средние века. Новое время. М., 1984.
132. Популярная художественная энциклопедии. Т.1-2. Изд.2-е, доп., 2001.
133. Радугина А.А. Культурология. М., 1997.
134. Реализм и художественные искания XX века. М., 1989.
135. Рудаков Александр, протоирей. Краткая история христ ианской церкви. М., 2000.
136. Русская художественная культура второй половины XIX века. М., 1983.
137. Рыбаков Б.А. Язычество Древней Руси. М., 2002.

138. Сарабьянов Д.В. История русского искусства конца XIX – начала XX в. М., 1993.
139. Современное западное искусство. XX век: Проблемы комплексного изучения. М., 1988.
140. Соколов Э.В. Культурология: Очерки теории культуры. М., 1994.
141. Средства массовой коммуникации и современная художественная культура. М., 2003.
142. Станькова Я., Пехар И. Тысячелетнее развитие архитектуры. М., 1987.
143. Стерлин Г.Д. Художественная жизнь России середины XIX века. М., 1991.
144. Струве В.В. Культура Древнего Египта. М., 1975.
145. Тайлер Э.Б. Первобытная культура. М., 1989.
146. Типология стилевого развития нового времени. М., 1976.
147. Токарев С.А. Ранние формы религии. М., 1990.
148. Тюляев С.И. Искусство Индии: архитектура, изобразительное искусство, художественные ремесла. М., 1981.
149. Федорова Е.В. Люди императорского Рима. М., 1990.
150. Феодорит, епископ Кирский. Церковная история. М., 1993.
151. Философия культуры. Становление и развитие. Сб. СПб., 1998.
152. Философия русского религиозного искусства XVI-XX вв.: Антология. М., 1983.
153. Фицджеральсд .П. Китай: Краткая история культуры. СПб., 1998.
154. Фрилинг Р. Христианство и ислам. М., 1997.
155. Хачутурян В.М. История мировых цивилизаций. М., 1998.
156. Хейзинга И. Осень Средневековья. М., 2003.
157. Холл Джеймс. Словарь сюжетов и символов в искусстве. М., 1997.
158. Христианство. Энциклопедический словарь. Т.1-3. М., 1993.
159. Чегодаев А.Д. Искусство Соединенных Штатов Америки от Войны за независимость до наших дней. М., 1960.
160. Человек и мир в японской культуре. Сб.статей. М., 1985.
161. Чернокозов А.И. История мировой культуры. Ростов-на-Дону, 1997.
162. Чизхолм Д. Ранние цивилизации. М., 1995.
163. Шейнина Е.Я. Энциклопедия символов. М., 2002.
164. Шпенглер О. Закат Европы. Т.1-2. М., 2003.
165. Щербатской Ф.И. Избранные труды по буддизму. М., 1988.
166. Энциклопедия живописи. М., 1997.
167. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Мн., 1984-1987.
168. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989.
169. Энцыклапедыя Беларусі. У 18 т. Тт.1-17. Мн., 1995-2000.
170. Юренев Р. Чудесное кино: Краткая история мирового кино. М., 1985.
171. Яковлев Е.Г. Искусство и мировые религии. М., 1989.
172. Яковец Ю.В. История цивилизаций. М., 1997.
173. Япония: идеология, культура, литература. Сб., М., 1989.

**Самастойная праца студэнтаў у працэсе падрыхтоўкі да экзамену на аснове пісьмовых і электронных лекцый выкладчыка**

1. Культура Асірыі.
2. Іслам. Культура Ірака.
3. Культура Антычнай Грэцыі эпохі элінізму.
4. Уплыў культуры Антычнага Рыма на еўрапейскую цывілізацыю.
5. Культура Еўропы эпохі Адраджэння.
6. Культура Еўропы эпохі Барока.
7. Узаемадзенне беларускай і рускай культур.
8. Савецкая культура.
9. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці сусветнай культуры ў XX–XXI стст.

**Формы арганізацыі самастойнай работы студэнтаў**

- Вывучэнне структурных кампанентаў (раздзелаў і тэм) падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, іншых частак ВМК;
- вывучэнне і канспектаванне хрэстаматый і зборнікаў;
- работа са слоўнікамі і энцыклапедычна-даведачнай літаратурай;
- пошукавая праца ў даведачна-бібліяграфічным аддзеле бібліятэкі, архіве, музеі;
- напісанне аналітычна-ацэначных тэкстаў (каментарыяў, водгукаў, рэцэнзій) па прачытаных крыніцах;
- выкананне кантрольных работ;
- распрацоўка іншых відаў наглядных матэрыялаў па вывучаемых тэмах, стварэнне мультымедыйных прэзентацый;
- напісанне тэматычных дакладаў ці эсэ, дыскусійных разважанняў па праблемных тэмах;
- выкананне разнастайных даследчых і творчых заданняў;
- падрыхтоўка да дзелавых гульняў, конкурсаў, канферэнцый і г.д.
- напісанне раздзелаў курсавых і дыпломных работ.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Антычная літаратура | Замежнай літаратуры | | |
| Славянскі фальклор | Тэорыі літаратуры | | |
| Тэорыя літаратуры | Тэорыі літаратуры | | |
| Гісторыя замежнай літаратуры | Замежнай літаратуры | | |
| Гісторыя рускай літаратуры | Рускай літаратуры | | |
| Гісторыя беларускай літаратуры | Гісторыі беларускай літаратуры, беларускай літаратуры і культуры | | |

**ЗМЕНЫ І ДАПАЎНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ**
**ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**
**НА _______/_______ВУЧЭБНЫ ГОД**

| №№ п/п | Змены і дапаўненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
(пратакол №__________ ад________________ 20__ г.)

Загадчык кафедры

_____________________ _____________________ _____________________
(ступень, званне) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта

_____________________ _____________________ _____________________
(ступень, званне) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)